**20 мая ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася IV Рэспубліканская выстава сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў "АРТ_АКАДЭМІЯ". Упершыню гэты праект Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі абжыў адну з лепшых арт-пляцовак сталіцы. Сёлетнім дэвізам выставы стаў "Зялёны. Выявы часу".**

# Свет усміхнуўся зялёным вокам



Студэнтка Жаночага інстытута "ЭНВІЛА" Таццяна Розум грацыёзна дэманструе сваю пастэль "Плады жыцця" (кіраўнік Д.Касянок).

Яны быццам "знайшлі" адна адну — "АРТ_АКАДЭМІЯ" з яе памкненнем аб'яднаць мастацкі рух ва ўсіх без выключэння айчынных ВНУ і галерэя "Універсітэт культуры" з яе галоўнай місіяй падтрымкі маладых таленавітых мастакоў незалежна ад іх "паходжання" — адзін з самых крэатыўных праектаў і адна з самых крэатыўных галерэй. Толькі што тут адпрацавала выстава надта ўжо незвычайнай выцінанкі выпускніцы Інстытута журналістыкі БДУ Надзеі Бука — вожык, які медытуе на дне бутэлькі з тасолам, панда з гузікам на твары, мандарыны на снезе... Але ж ужо даўно шугае вясна і афарбоўвае краіну ва ўсе магчымыя адценні зялёнага! Афарбавалася ў зялёны і галерэя: зялёныя стужачкі на парэнчах яшчэ ля ўвахода, зялёныя элементы ў адзенні тых, хто адкрываў выставу (а сярод іх былі заўважаны вядомыя людзі), зялёныя творы на сценах і на падставах...

Зялёны ўжо чацвёрты з колераў "АРТ_АКАДЭМІІ" пасля белага ("прарыў у бязмежнасць"), блакітнага ("крылы памкненняў") і жоўтага ("блікі шчасця"). Гэтую ідэю (будаваць калектыўную экспазіцыю з арыентацыяй на нейкі адзін дамінуючы колер), напрыклад, дырэктар галерэі "Універсітэт культуры" Дзяніс Барсукоў лічыць надзвычай удалай: "Безумоўна, былі пэўныя цяжкасці з самой інсталяцыяй, паколькі трэба было адначасова прадставіць творы як пачынаючых прафесіяналаў (з колькі мастацка-культуралагічны, асветніцкі. І гэта вельмі важна".




Сярод мноства прадстаўленых работ без цяжкасці знаходзіш залацінкі: велічны жывапісны партрэт "Іна" — работа студэнткі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава Н.Верамеевай, пяшчотная пастэль "Плады жыцця" студэнткі Жаночага інстытута "ЭНВІЛА" Т.Розум, мяккая пастараль "Ціхая мая Радзіма" В.Ламаносенка з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, цудоўныя серыі мастацкага фота "Каштоўнасці" і "У бацькоўскім доме" адпаведна студэнтак Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтва К.Рамашка і К.Філановіч, дыхтоўны габелен "Купалле" С.Аўчар з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, эфектная сурвэтка, выкананая навучэнкай Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа П.Дзеснік у рэдкай "новай-старой" тэхніцы філе-гіпюрнай вышыўкі.

Ля некаторых твораў, як, у прыватнасці, ля "біяметалічных" істот студэнта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна Антона Мартынюка, спыняешся проста як укапаны і не перастаеш дзівіцца: як можна было з нейкіх утылізаваных жалязяк стварыць такія цуды — "Пчалу", "Яшчарку", "Пацука", "Рапуху", "Коніка"... Заўважаеш, што не адзін ты такі агаломшаны фантазіяй студэнта з Брэста. Побач у такім жа, відавочна, здзіўленні схіліўся над Антонавай "Яшчаркай" і сябар экспертнай групы "АРТ_АКАДЭМІІ", мне гэта сама Антаніна, калі звярнула маю ўвагу на тое, што на апошнім фотаздымку серыі на гадзінніку ўжо адсутнічаюць стрэлкі. І зноў цытата: "Счастливые часов не наблюдают... Молада-зелена, і можна не зважаць на час..."

А колькі яшчэ такіх вось прыхаваных сэнсаў, завуаліраваных метафар і сімвалаў, вядомых толькі моладзі і прыналежных толькі маладому мысленню і адчуванню свету, рассыпана на сёлетняй "АРТ_АКАДЭМІІ"! Відавочна, экспертнай групе (а гэта ўжо згаданыя Дзяніс Барсукоў і Юрый Будзько, сябар Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза дызайнераў Сяргей Стэльмашонак, вядомыя фотамастакі Міхаіл Маруга і Уладзімір Шуба) будзе нялёгка вызначыць пераможцаў у наступных намінацыях: "Захаванне беларускіх нацыянальных традыцый", "Арыгінальнае раскрыццё тэмы", "Канцэптуальнасць і творчае рашэнне", "Дызайн і крэатыўная ідэя", "Цэласнасць і змястоўнасць вобраза", "Інавацыйная тэхніка", "Творчая індывідуальнасць". Але яны абавязкова выберуць гэтых пераможцаў, і лепшыя зялёныя выявы часу яшчэ



Сябар экспертнай групы "АРТ_АКАДЭМІІ", выдавец, прадзюсар фестывалю авангарднай моды і сучаснага мастацтва "Мамант" Юрый Будзько доўга не мог адвесці вачэй ад "Яшчаркі" і іншых тэхнакратычных стварэнняў Антона Мартынюка (БрДУ імя А.С.Пушкіна, кіраўнікі В.Марчук і М.Марчук).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ